

# РАЧОК Фама Іосіфавіч

Нарадзіўся ў 1932 годзе ў вёсцы Каняўцы Зэльвенскага раёна.

Працоўны шлях пачаў 14-гадовым падлеткам пасля заканчэння пачатковай школы. Працаваў на сельскай гаспадарцы спярша прычэпшчыкам, а пасля трактарыстам у вытворчым участку №5 в.Каняўцы. Зарэкамендаваў сябе вопытным і адказным работнікам. Яму прысвоены званні “Заслужаны калгаснік” і “Ударнік камуністычнай працы”. За праяўленую працоўную доблесць узнагароджаны медалём “За працоўную выдатнасць”, бронзавым медалём ВДНГ, юбілейным медалём да 100-годдзя У.І.Леніна.

Пастановай праўлення калгаса “Прагрэс”, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 08.02.1982 г. за вялікія заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці Рачок Ф.І. занесены ў кнігу Працоўнай Славы гаспадаркі.